дэбют

Юрка Буйнюк



...цёплыя шчырыя словы
самоце стануць ценем...

# Нічога не гавары

### Крык самоты

Калі крык самоты ў сабе пачую
Калі ажыве тое, што ня выпалілася
І сыйдуцца adna іскра з іскрай другой
У полымя агеньчыка пачуцьця
Верныя сэрцы сагрэюцца сьвятлом
Гэта будзе цяпло вымаленай z samoty веры
Складзенае з супольнай праўды жыцьця
Ня будзе лічыцца плывучы час
Гэта будзе шчасьце ясных хвілінаў
Гэта будзе знак што я не памёр

### Крык самоты-2

калі з радкоў верша словаў сэрцу верных
з сумных самотных кропляў вячэрняга дажджу

намалюеш мой штодзённы партрэт
на вуліцы восеньскага вечару
пачую нясьцерпныя крокі сэрца
веру, што азірнуўшыся назад
не ператворыцца ў соль цярпеньня
а цёплыя шчырыя словы
самоцестануць ценем

**Стрыптыз думак**

*сарамлівым ды маладым*
*паэткам прысьвячаю*

Не
Не
Не
Не!
— усклікнула ты
— ня дам табе ключа
ад брамкі агароду
думак тваіх
Не
Не
Не
Не!
як котка бароніць сваіх дзяцей
так ты сьцеражэш тэрыторыі сваіх думак
— не ўпушчу цябе ў агарод маіх
эмоцыяў
бо разгарыцца агнём галавенька
шчырасьці
лепш хай загарыць вогнішчам тваёй
адкрытасьці
добра? — ціха запытала ты
— добра, – сумна кіўнуў я галавою.

З напружанасьці настрояў
скінуў я з сябе
плашч тугі
кашулю суму
сарочку моцы
штаны слабасьці...
усё...
усё...
усё...
маё-тваё

сум-радасьць
моц-слабасьць
вера-паганства
шчасьце-наканаваньне
нянавісьць-каханьне
нахабнасьць-стрыманасьць.
Напаіўшы яе цікавасьць
Тайнай крыніцы думак сваіх
Пытаю:
— Задаволеная?
— Так, — ціха прамовіла яна.

**Я таньчу**

*...Закрываю вочы, вырастаюць, крылы*
*І нясуць кудысьці ў блакіт...*
З тэксту песьні рок-гурта Б.Н.

Звар'яцелы
Пад задорныя крыкі
Рыфаў электрагітараў
Я таньчу апантана
Праз хвалю мора рок-энд-ролу
Апошні магіканін
Музыкай забіваю думкі
Узьлятаю з прорвы пакутаў
Свабодным птахам
Пакутаў самотнага сэрца
Сам сярод чатырох сьценаў
Выкідаю з сэрца пакутлівую самоту
Як вар'ятны сон
Як апантаны танцор
Я таньчу
Я крычу
Я ў сэрцы маўчу
Я сам

**У Ноч на Купалу**

Не
Нічога не гавары
Адгарні свае валасы славянскія
Хай пачую крык вянкоў васількових
вачэй тваіх
У іх вычытаю кліч купальскай ночы

Ці-ха
Нічога не гавары
Хай маўчаньне словаўператворыцца
ў мелодыю сэрцаў
У далікатную гутарку далоняў
Супольны рытм нашых сэрцаў
Ладдзю жыцьця закалыша
Не
Нічога не гавары
Не чакай сьвітаньня
З нецярплівых словаў чаканьня
Спляці вянок на зары
Не
Нічога не гавары
Хай маўчаньне верным будзе вуснам
тваім
Гэта ў тваіх вачах я сам вычытаю
Адно слова – .. ...

**Пасажыр лёсу**

У аўтобус настрояў
Вяртаньняў і спадзяваньняў
Сеў я нядаўна
Сьціскаючы білет лёсу свайго
Чакаю на наступным прыпынку
Можа яна зойме месца побач са мною
Каб супольна пагартаць
Карціны вобразаў жыцьця
У празрыстым акне аўтобуса
У каляровым дажджы мыю сон
Часам толькі яркі сонца ключ-промень
Адчыняе цёмныя дзьверы самоты
Заўсёды ўцякаю ад цёмных пейзажаў.